# Хроніка мастацкага жыцця

* * *

18 сакавіка ў Мастацкім музеі (філіял УК “ВАКМ”) адкрылася юбілейная выстава Міхася Ляўковіча “Дзе Ты – там Я”. Міхась Васільевіч Ляўковіч скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава ў 1976 годзе (вучыўся ў Л.С. Анцімонава, А.Г. Арлова). А з 1976 па 2015 год працаваў старшым выкладчыкам жывапісу, малюнка і кампазіцыі на кафедры выяўленчага мастацтва. У 1983 і 1989 гадах вучыўся ў Маскве ў народнага мастака СССР К.М. Максімава. Сябра Саюза мастакоў РБ, старшыня суполкі мастакоў “Віцебская акварэль” з 1995 па 2011 г.

Міхась Ляўковіч – вядомы беларускі мастак, яркі прадстаўнік Віцебскай мастацкай школы, працуе ў розных жанрах – у акварэлі і алейным жывапісе. На выставе, прымеркаванай да 70-гадовага юбілею мастака, былі прадстаўлены творы рознага часу, у тым ліку абстрактныя кампазіцыі апошніх гадоў. Можна вылучыць гістарычныя палотны (“Альгерд у Віцебску” (2014), “Падарожжа ў мінулае” (2009)); партрэты (“Бабуля Аляксандра” (1997), “Бабуля Наталля” (1997), “Партрэт матулі” (2000), “Партрэт Святланы” (1991), “Партрэт дачкі Марыі” (2011), “Рамантычны партрэт Святланы” (2011), “Партрэт Раісы Грыбовіч у ролі Рагнеды” (2001), “Пятро Ламан у ролі Несцеркі” (2019–2020); пейзажы і нацюрморты (“Залаты звон” (2007), “Нацюрморт на сіняй шафцы” (2018–2019), “Букет для Святланы” (2020) і інш.).

Сёння цэнтральнае месца ў творчасці мастака займаюць асацыятыўныя кампазіцыі, сярод якіх на выставе глядач мог убачыць “Nuevo Tango. Новае танга” (2020), “Кастрычнік дэкарацыі расставіў” (2020), “Летняе сонцастаянне” (2017), “Пераўтварэнне–II” (2017), “У след за зімовым рэхам” (2018), “Вясныя пераліўы” (2020), “Серэнада” (2020), “Церпкае віно” (2020).

Міхась Ляўковіч узнагароджаны медалём “За заслугі ў выяўленчым мастацтве” Беларускага саюза мастакоў, ганаровым медалем С.-Пецярбургскага таварыства акварэлі імя Бенуа. Творы мастака знаходзяцца ў дзяржаўных і прыватных калекцыях Беларусі, Украіны, Германіі, Францыі, Іспаніі, Італіі, ЗША, Чэхіі, Польшчы, Расіі, Літвы, Латвіі і інш. За апошнія 15 год М. Ляўковіч быў удзельнікам каля пяцідзесяці міжнародных і рэгіянальных выстаў, у тым ліку біенале акварэлі ў Віцебску, Полацку, Мінску, Каўнасе, Іспаніі, С.-Пецярбургу, Петразаводску, Стамбуле.

* * *

27 сакавіка ў Мастацкай галерэі г. Шауляй (Літва) была разгорнута персанальная выстава дацэнта кафедры выяўленчага мастацтва М. Цыбульскага, у якой прадстаўлена больш за 30 кампазіцый, выкананыя ў тэхніцы гуашы. Але ў сувязі з пандэміяй каронавіруса амаль што зманціраваная экспазіцыя не змагла адкрыцца для наведвання гледачоў і была прадстаўлена ў віртуальным фармаце, на сайце мастацкай галерэі ŠIAULIŲ DAILĖS GALERIJA.

* * *

Пераможцай конкурсу Федэрацыі еўрапейскіх фатографаў стала беларуска, ураджэнка Віцебска Дар’я Матросава, у недалёкім мінулым выпускніца мастацка-графічнага факультэта ВДУ. Дар’я стала абсалютнай пераможцай конкурсу і прызнана “Лепшым прафесійным еўрапейскім фатографам–2020”. Яна першая жанчына-фатограф, якая атрымала гэтае званне, а таксама першы фатограф з Усходняй Еўропы. Таксама Дар’я стала пераможцай у намінацыі “Ілюстрацыя, лічбавае і выяўленчае мастацтва”. У гэтым годзе ў конкурсе прынялі ўдзел больш за 2200 фотаработ з 29 розных краін. Цырымонія ўзнагароджання павінна была адбыцца ў Рыме. Але з-за каронавіруса вынікі былі падведзены анлайн.

* * *

1 красавіка ў Музеі гісторыі і культуры г. Наваполацка адкрылася выстава “Творца Дэбют”, складзеная з дыпломных работ студэнтаў мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава.

* * *

30 красавіка ў Музеі гісторыі прыватнага калекцыяніравання адбылася прэзентацыя выставачнага праекта “Маршалы Перамогі”. На выставе прадстаўлена ваенна-гістарычная мініяцюра, аўтарам якой з’яўляецца Ігар Васільевіч Гарбуноў – дацэнт кафедры дызайну МГФ ВДУ імя П.М. Машэрава. Цэнтральнае месца ў экспазіцыі займаюць мініяцюрныя фігуркі маршалаў Савецкага Саюза (Г.К. Жукава, К.К. Ракасоўскага, Л.А. Говарава, І.С. Конева, Р.Я. Маліноўскага, А.М. Васілеўскага, Ф.І. Талбухіна, К.А. Мерацкова, І.Х. Баграмяна). На выставе аўтар таксама прадставіў фігуркі ўдзельнікаў Руска-японскай вайны, Балканскіх войнаў, войнаў у краінах Усходняй Еўропы 1918–1922 гг., а таксама фігуры ўдзельнікаў Першай і Другой сусветных войнаў розных краін свету (усяго больш за 100 фігур) у ваеннай уніформе.



Рэпазіторый ВДУ